16. НГАБ, ф. 242, воп. 1, спр. 414, л. 1; Памятная книжка Виленского генерал-губернаторства на 1868 год. СПб., 1868. С. 269—275; Приложение ко всеподданнейшему отчету Минского губернатора за 1875 год. Б. м., б. г. С. 154.
17. НГАБ, ф. 242, воп. 1, спр. 197.
18. Сборник документов музея графа М. Н. Муравьева / Сост. А. Белецкий. Вильна, 1906. Т. 1. С. LXXXV.
19. НГАБ, ф. 295, воп. 1, спр. 2157, л. 3—4; НГАБ, ф. 242, воп. 1, спр. 1060, л. 1.
20. НГАБ, ф. 242, воп. 1, спр. 823.
21. НГАБ, ф. 242, воп. 1, спр. 1605, л. 2 адв.
22. НГАБ, ф. 242, воп. 1, спр. 156.
23. НГАБ, ф. 242, воп. 1, спр. 832, л. 106.
24. Доклад Высочайше учрежденной комиссии для исследования нынешнего положения сельского хозяйства и сельской производительности в России: Докл. СПб., 1873. С. 36.
25. НГАБ, ф. 295, воп. 1, спр. 3069, л. 170 адв.
26. НГАБ, ф. 1430, воп. 1, спр. 32132.

*А. П. Жытко*

# АДНОСІНЫ ЦАРЫЗМУ ДА КАРПАРАТЫЎНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ДВАРАНСТВА БЕЛАРУСІ Ў ПАРЭФОРМЕННЫЯ ГАДЫ

Каб зразумець сутнасць палітыкі самадзяржаўя ў адносінах да карпаратыўнай арганізацыі вышэйшага саслоўя краю, неабходна звярнуць увагу на яе структуру, функцыі і ролю ў сістэме як унутрысаслоўнага жыцця дваранства, так і мясцовага кіравання.

Карпаратыўная арганізацыя расійскага дваранства заканадаўча была аформлена Даравальнай граматай 1785 г., па якой вышэйшае саслоўе атрымала пэўнае самакіраванне, усю павятовую і некаторую частку губернскай улады. Заканадаўства па гэтых пытаннях з некаторымі зменамі захавалася да 1917 г. Пасля далучэння беларускіх зямель да імперыі такія ж прывілеі былі прадстаўлены і набілітэту Беларусі.

Закон прадугледжваў пагубернскую арганізацыю вышэйшага саслоўя. Вышэйшымі органамі вобшчастваў з'яўляліся губернскія і павятовыя сходы. На павятовых сходах звычайна займаліся падрыхтоўкай да губернскіх: праверкай спісаў дваран павета, высвятленнем іх выбарчых правоў, папярэднім абмеркаваннем асобных пытанняў і г. д. Усе вышэйшыя карпаратыўныя справы вырашаліся на губернскіх сходах. На іх заслухоўваліся справаздачы аб выкананні прынятых раней пастаноў, зацвярджаліся зборы на ажыццяўленне прыватных дваранскіх павіннасцей, выбіраліся ўсе службовыя асобы карпаратыўных органаў: губернскія і павятовыя прадвадзіцелі, дэпутаты і сакратары дваранства, засядацелі дваранскіх апек, кандыдаты на замяшчэнне шэрага каронных пасад па мясцовым кіраванні [1, ст. 167; 2]. Ім належала

права — і гэта лічылася адной з важнейшых прывілей — падаваць праз губернскіх прадвадзіцеляў ці дэпутатаў прашэнні ці скаргі губернскаму начальству, міністрам і непасрэдна імператару.

Прадвадзіцелі дваранства з'яўляліся адным з важнейшых інстытутаў і ў дваранскай саслоўнай арганізацыі, і ў сістэме мясцовага кіравання. Кола абавязкаў прадвадзіцеляў было вельмі шырокім і разнастайным. Адзін пералік камісій і камітэтаў, у якіх яны з'яўляліся старшынямі ці членамі, сведчыць аб дачыненні іх амаль да ўсіх сфер мясцовага кіравання і гаспадаркі [1, ст. 294—295]. Губернскі прадвадзіцель афіцыйна лічыўся першай пасля губернатара асобай у губерні. Калі губернскі прадвадзіцель усё ж такі часткова засланяўся губернскай уладай, то павятовы быў сапраўды гаспадаром павета. Ён фактычна замяняў павятовае звяно ў мясцовым бюракратычным апараце.

Кола дзейнасці павятовых прадвадзіцеляў дваранства ахоплівала ўсе бакі жыцця насельніцтва павета як у грамадскіх і саслоўна-дваранскіх, так і ў судовых і адміністрацыйных адносінах. У пачатку XX ст. яны былі старшынямі дваранскай апекі, павятовых з'ездаў па выбарах у Дзяржаўную думу, павятовага з'езда міравых пасрэднікаў, чыншавай камісіі, устаноў па воінскай і ваенна-конскай павіннасцях, землеўладкавальнай камісіі, бальнічнага савета, камітэта грамадскай аховы здароўя, камітэта папячыцельства аб народнай цвярозасці, ацэначнай камісіі, часовага камітэта па кіраванні арыштанцкім домам, камісіі па складанні спісаў прысяжных засядацеляў і г. д. Па ўсіх гэтых установах прадвадзіцель дваранства нёс адказнасць як за нагляд за іх законнай дзейнасцю, так і за справаводства ўсіх падначаленых яму канцылярый. Акрамя гэтага, прадвадзіцель павятовага дваранства павінен быў прымаць удзел у сходах прадвадзіцеляў і дэпутатаў дваранства губерні, асобай канцылярыі акруговага суда і судзебнай палаты, ажыццяўляць праверку выканання рашэнняў сялянскіх таварыстваў аб выгнанні распусных членаў, правяраць дзейнасць земскіх начальнікаў і валасных упраў, выдаваць розныя пасведчанні і г. д. [3, с. 170].

У беларускіх губернях апошнія выбары на павятовыя і губернскія сходы адбыліся ў канцы 1858 — пачатку 1859 г. Наступныя выбары павінны былі адбыцца ў снежні 1861 і ў студзені 1862 гг. Але з 1861 г. у краі пачаліся хваляванні сярод дваран рымска-каталіцкага веравызнання, якія складалі тут, у параўнанні з прадстаўнікамі іншых канфесій, абсалютную большасць. У пачатку 1861 г., у адпаведнасці з царскім указам, адтэрміноўваліся дваранскія выбары ў Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай губернях у сувязі з пераводам іх на ваеннае становішча [4, л. 75]. На падставе правіл ад 5 жніўня 1861 г., пры абвяшчэнні пераводу

якіх-небудзь мясцовасцей Заходняга краю на ваеннае становішча генерал-губернатару давалася права вызваляць ад займаемых пасад чыноўнікаў усіх установ [5]. З 27 кастрычніка 1861 г. гэта права распаўсюджвалася і на прадвадзіцеляў дваранства ўсіх заходніх губерняў [3, с. 40]. У сувязі з адтэрміноўкай дваранскіх выбараў прадвадзіцель дваранства Віцебскай губерні меў намер склікаць у 1862 г. губернскі сход для абмеркавання такіх прыватных пытанняў, як заснаванне таварыства сельскай гаспадаркі, ахвяраванне сродкаў на адкрыццё жаночай навучальнай установы ў Віцебску і інш. Але міністр унутраных спраў забараніў скліканне гэтага схода [6].

Пасля пачатку паўстання, у якім актыўны ўдзел бралі дваранекатолікі, рэпрэсіі ў адносінах да вышэйшага саслоўя краю ўзмацніліся. Так, паводле ўказа ад 18 красавіка 1863 г., у сувязі з выхадам у адстаўку 28 асоб Гродзенскай губерні, якія займалі пасады павятовых прадвадзіцеляў дваранства, павятовых суддзяў і міравых пасрэднікаў, гэтыя пасады былі замешчаны чыноўнікамі па прызначэнні ўрада [4, л. 75]. Спачатку гэты ўказ распаўсюджваўся толькі на вакантныя пасады. Па меркаванні Заходняга камітэта, згодна ўказу ад 27 мая 1864 г. усе службовыя месцы ў краі, а роўна і іх начальнікі, якія мелі непасрэднае дачыненне да народа, павінны былі быць заменены выключна асобамі рускага паходжання [7, л. 60].

Па законе ад 17 сакавіка 1867 г., начальніку Паўночна-Заходняга краю было дадзена права замяшчаць пасады ўсіх прадвадзіцеляў дваранства толькі асобамі рускай нацыянальнасці па прызначэнні ўрада [7, л. 104]. У выніку пасады прадвадзіцеляў дваранства ў краі занялі альбо мясцовыя рускія памешчыкі, альбо чыноўнікі з унутраных губерняў імперыі, якія не належалі да дваранскага саслоўя. Пазней Міністэрства ўнутраных спраў вымушана было прызнаць, што рускія памешчыкі не мелі ў краі ні ўплыву, ні аўтарытэту. Тыя ж прызначаныя прадвадзіцелі, якія не валодалі зямельнай уласнасцю ў беларускіх паветах, «яшчэ менш адпавядалі свайму прызначэнню. Першых мясцовыя дваране пад уплывам глухой палітычнай варожасці ігнаруюць, а другіх прама цураюцца» [7, л. 63].

Праз некаторы час склалася такая сітуацыя, што пасады некаторых павятовых прадвадзіцеляў дваранства нельга было замяшчаць рускімі землеўладальнікамі ў сувязі з тым, што ў краі яны ці фармальна валодалі землямі, ці не жадалі служыць. Таму ў 1868 г., калі Аляксандр II праязджаў праз Вільню, генерал-губернатару Патапаву было дазволена ў крайніх выпадках прызначаць на пасады павятовых прадвадзіцеляў дваранства асоб каталіцкага веравызнання [3, с. 42]. У вы-

ніку значная большасць пасад прадвадзіцеляў дваранства была замешчана католікамі з асяроддзя буйнейшых і ўплывовых памешчыкаў. Такія асобы на неабмежаваны тэрмін заставаліся на гэтых пасадах [7, л. 105]. Так, толькі ў Мінскай губерні на канец 1869 г. з дзевяці павятовых прадвадзіцеляў дваранства сем былі католікамі. Гэта Ваньковіч з Мінскага, Наркевіч-Іодка з Ігуменскага, Кеневіч з Мазырскага, Горват з Рэчыцкага, князь Друцкі-Любецкі з Пінскага, Вайніловіч са Слуцкага і граф О'Рурк з Навагрудскага паветаў [8].

Пад уплывам мясцовых дваран Патапаў у сваіх справаздачах за 1871—1873 гг. на імя цара паставіў пытанне аб магчымасці правядзення дваранскіх сходаў і выбараў на іх асоб на замяшчэнне пасад дваранамі. На адной справаздачы Аляксандр II зрабіў паметку «Абмеркаваць». Але віленскі генерал-губернатар Каханаў у адказ на пытанне Міністэрства ўнутраных спраў, якім будзе яго меркаванне, спаслаўся на складанае міжнароднае становішча імперыі ў сувязі з руска-турэцкай вайной і рэкамендаваў адкласці вырашэнне пытання на больш позні час [9]. Акрамя гэтага, Каханаў лічыў, што павятовыя прадвадзіцелі дваранства рымска-каталіцкага веравызнання садзейнічалі ў краі польскаму ўплыву. Ён выдаў распараджэнне, па якім новыя вакансіі прадвадзіцеляў дваранства павінны замяшчацца толькі дваранамі рускага паходжання. Але ў сувязі з тым, што ў краі было мала рускіх дваран-землеўласнікаў, якія маглі бясплатна выконваць абавязкі прадвадзіцеляў, Каханаў лічыў, што неабходна аднавіць у кожным павеце з'езды міравых пасрэднікаў, на якіх старшынствавалі б прадвадзіцелі дваранства. Такім чынам, пасада старшыні і адначасова прадвадзіцеля была б платнай [10].

У 1885—1886 гг. Каханаў распачаў перапіску з міністрам унутраных спраў наконт аднаўлення з'езда міравых пасрэднікаў. У выніку, па законе ад 30 мая 1888 г., з'езды былі адноўлены ва ўсіх губернях Паўночна-Заходняга краю [11]. Гэты закон прывёў да карэнных змен у складзе прадвадзіцеляў дваранства, таму што сумяшчэнне католікамі пасад старшынь павятовых з'ездаў міравых пасрэднікаў і прадвадзіцеляў дваранства супярэчыла закону ад 22 мая 1864 г., па якім католікі не маглі займаць пасад, блізка звязаных з народам. На гэтай падставе Каханаў цыркулярам ад 12 ліпеня 1888 г. прапанаваў начальнікам губерняў звольніць усіх павятовых прадвадзіцеляў дваранства рымска-каталіцкага веравызнання і замяніць іх праваслаўнымі, што ў хуткім часе і было зроблена [4, л. 77]. Да канца стагоддзя абсалютная большасць прадвадзіцеляў дваранства былі выхадцамі з унутраных губерняў імперыі.

У пачатку XX ст. рэзка абвастрылася як унутрыпалітычнае, так і знешнепалітычнае становішча Расіі. Пытанне аб аднаўленні Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. усё часцей узнікала і ў Польшчы, і за яе межамі. Польскі сепаратызм стаў больш адчувальным. Пры гэтым разыгрывалася і палітычная карта Беларусі. Найбольш значнай эканамічнай і палітычнай сілай у краі з'яўлялася памеснае дваранства рымска-каталіцкага веравызнання. Новыя імпульсы адчулі губернатары беларускіх губерняў. Таму, відаць, невыпадкова магілёўскі губернатар Клінгенберг у сваёй справаздачы за 1902 г. узняў пытанне аб прызначэнні на пасады павятовых прадвадзіцеляў дваранства мясцовых дваран. Мінскі губернатар падтрымаў гэту ініцыятыву. Акрамя таго, ён прапанаваў арганізаваць выбары кандыдатаў на пасаду губернскага прадвадзіцеля дваранства. На яго думку, выбары павінны адбыцца на дваранскіх дэпутацкіх сходах і сходах павятовых прадвадзіцеляў дваранства, пры гэтым кандыдаты павінны выбірацца толькі з ліку павятовых прадвадзіцеляў дваранства [7, л. 3, 7—8]. Гродзенскі губернатар выказаўся і за выбары дэпутатаў дваранскіх сходаў і апек [7, л. 18]. Сур'ёзнай рэакцыі з боку ўрада і імператара на гэтыя прапановы не было.

У канцы 1904 г. актывізаваўся ліберальна-апазіцыйны (асноўную сацыяльную сілу складала дваранская інтэлігенцыя) і сацыялістычны рухі. Імперыя імкліва рухалася да рэвалюцыі. Адным з галоўных пытанняў было нацыянальнае. У сувязі з гэтым урад вымушаны быў прадпрыняць некаторыя прэвентыўныя меры. Так, імянным указам ад 12 снежня 1904 г. Сенату даручалася распрацаваць шэраг мер па замацаванні дзяржаўнага і грамадскага ладу, у прыватнасці даручалася «перагледзець дзеючыя пастановы, якія абмяжоўвалі правы іншародцаў і ўраджэнцаў асобных мясцовасцей імперыі» [7, л. 389].

Адной з праблем, якая патрабавала свайго вырашэння, была праблема аднаўлення дваранскіх выбараў у дзевяці заходніх губернях. Гэтымі пытаннямі заняўся Камітэт міністраў на сваіх пасяджэннях 15, 22 і 23 сакавіка 1905 г. У выніку дыскусій, якія разгарэліся на гэтых пасяджэннях, урад выказаўся за «аднаўленне дваранскіх сходаў з прадастаўленнем ім права выбіраць дэпутатаў і павятовых прадвадзіцеляў дваранства» [3, с. 10]. Пры гэтым большасць членаў Камітэта міністраў не пагадзіліся з тым, што ў выніку выбараў пасады прадвадзіцеляў займуць выключна асобы польскага паходжання. Яны матывавалі гэта тым, што ў некаторых мясцовасцях краю існуе колькасная перавага рускага насельніцтва. Акрамя гэтага, практыка паказала, што ў шматлікіх сельскагаспадарчых таварыствах краю, у склад якіх уваходзілі як каталікі, так і праваслаўныя, апошнія нярэдка выбіраліся старшынямі.

Як было сказана вышэй, у дзевяці заходніх губернях прызначаныя ўрадам павятовыя прадвадзіцелі дваранства адначасова выконвалі функцыі як прадвадзіцеляў, так і старшынь павятовых з'ездаў міравых пасрэднікаў. Па сутнасці, яны сканцэнтравалі ў сваіх руках усю адміністрацыйную ўладу ў паветах. У сувязі з гэтым пытанне аб функцыях выбарных прадвадзіцеляў было адным з галоўных. Камітэт міністраў зыходзіў з таго, што «асноўная мэта нашай палітыкі ў дзевяці заходніх губернях павінна застацца нязменліваю і зыходзіць з умацавання рускай перавагі і аслаблення тут польскага ўплыву» [7, л. 390]. Таму «ўскладанне ў Заходнім краі на прадвадзіцеляў дваранства, якія пры аднаўленні выбараў могуць аказацца выбранымі з ліку палякаў, адміністрацыйных абавязкаў наўрад ці магчыма, раз-пораз яно можа быць шкодным для поспеху рускай справы ў краі. Было б вельмі складаным даручыць ім вядзенне сялянскай справы і нагляд у гэтых адносінах за земскімі начальнікамі з правам іх абрэвізавання, а таксама пажадана ўстраніць прадвадзіцеляў-палякаў і ад старшынства ў вучылішчных саветах» [7, л. 390].

Выкладзеныя меркаванні пераканалі ўрад у мэтазгоднасці перадачы толькі ўнутрысаслоўных функцый. Усе ж адміністрацыйныя абавязкі павінны выконваць старшыні павятовых з'ездаў міравых пасрэднікаў. Існавала наступная агаворка: калі прадвадзіцель акажацца адданым рускай справе, то яму ў якасці выключэння могуць перадавацца і функцыі старшыні павятовага з'езда міравых пасрэднікаў.

Камітэт міністраў вырашыў, што міністр унутраных спраў павінен паклапаціцца аб разглядзе прапаноў урада ў Дзяржаўным савеце без папярэдніх зносін з ведамствамі і генерал-губернатарам. Дзяржаўны савет павінен быў зацвердзіць іх у прымальна кароткі тэрмін. Хоць у імянным указе ад 1 мая 1905 г. і гаварылася аб аднаўленні дваранскіх выбараў у дзевяці заходніх губернях, але тут быў дадатак, па якім асобы польскага паходжання не маглі займаць адміністрацыйных пасад у тых галінах народнай гаспадаркі, якія курыравала Міністэрства ўнутраных спраў. Калі ж улічыць, што ў цэнтральных губернях і асабліва ў паветах займаць гэтыя адміністрацыйныя пасады павінны былі прадвадзіцелі дваранства, то ў заходніх губернях, дзе патэнцыяльнымі прадвадзіцелямі маглі стаць католікі, узнікла праблема наконт сумяшчэння палажэнняў аб выбарах і функцый прадвадзіцеляў дваранства [4, л. 427; 7, л. 394].

Пытанне аб аднаўленні дваранскіх выбараў абмяркоўвалася ў Дзяржаўным савеце 5 і 30 лістапада 1905 г. На пасяджэнні 30 лістапада 1905 г. было адзначана, што ў сучасных умовах у сувязі з выданнем маніфеста 17 кастрычніка 1905 г. такі закон не можа быць прыняты без адабрэння Дзяржаўнай думы. З другога боку, на падставе царскага

наказу ад 23 верасня 1905 г., разгляду Дзяржаўнага савета належаць усе справы, якія нельга адкладваць. У сувязі з гэтым 25 членаў Дзяржаўнага савета лічылі, што пастаўленае пытанне якраз адпавядае царскаму наказу. Але законапраект, які падрыхтавала Міністэрства ўнутраных спраў, быў прадстаўлены не Булыгіным, а кіраўніком міністэрства Дурнаво. Апошні ўнёс папраўкі ў законапраект, па якім павятовыя прадвадзіцелі дваранства ў дзевяці заходніх губернях надзяляліся тымі ж паўнамоцтвамі, што і прадвадзіцелі ўнутраных расійскіх губерняў, гэта значыць не толькі саслоўнымі, але і адміністрацыйна-кіруючымі.

25 членаў Дзяржаўнага савета абгрунтавалі сваю пазіцыю тым, што ў краі дваранства з вялікім нецярпеннем чакае практычнай рэалізацыі закона ад 1 мая 1905 г. У выпадку станоўчага вырашэння пытання першыя дваранскія выбары ў Заходнім краі павінны былі завяршыцца да выбараў дэпутатаў ад гэтых губерняў у Дзяржаўную думу. Гэтыя члены Дзяржаўнага савета адзначылі, што «неадкладнае вяртанне мясцоваму дваранству правоў, якіх яно доўгі час было пазбаўлена, несумненна задаволіць яго і будзе спрыяць мірнаму жыццю ў краі» [3, с. 85]. Яны лічылі, што дэпутаты ад дзевяці заходніх губерняў разам з Царствам Польскім будуць складаць значную аднародную групу ў Дзяржаўнай думе, таму і спадзяваліся, што аднаўленне дваранскіх выбараў у краі будзе спрыяць расколу паміж дэпутатамі ад заходніх губерняў і Царства Польскага. 25 членаў Дзяржаўнага савета былі супраць перадачы законапраекта ў Дзяржаўную думу, таму што яна збярэцца не раней за канец першай чвэрці 1906 г. і спачатку будзе разглядаць аграрнае, яўрэйскае, земскае і іншыя пытанні.

50 членаў Дзяржаўнага савета лічылі, што калі б за аснову быў узяты законапраект, распрацаваны Камітэтам міністраў і ўхвалены Булыгіным, то ён падлягаў бы неадкладнаму разгляду. Але рэдакцыя Дурнаво мяняла пытанне карэнным чынам. Таму такую сур'ёзную праблему, на іх думку, павінна вырашаць толькі Дзяржаўная дума. Акрамя гэтага, яны лічылі, што калі прыняць прапанаваны праект, то ўсё роўна дваранскія выбары ў лепшым выпадку адбудуцца не раней за люты 1906 г. Да гэтага часу выбары ў Дзяржаўную думу будуць праведзены. Такім чынам, так ці інакш не прыходзілася разлічваць на вернападданніцкія пачуцці дваранства заходніх губерняў [3, с. 87].

На думку нязначнай часткі членаў Дзяржаўнага савета, Дзяржаўная дума паставіць пытанне аб рэформе органаў мясцовага кіравання, што ўрэшце прывядзе яго да бессаслоўнай формы, таму няма ніякага сэнсу спяшацца з законазацвярджэннем гэтага праекта. У выніку 2/3 членаў Дзяржаўнага савета прагаласавалі за перадачу законапраекта праз міністра ўнутраных спраў у Дзяржаўную думу.

Думку правага крыла Дзяржаўнага савета агучыў Зіноўеў. Ён лічыў, што аднаўленне дваранскіх выбараў у дзевяці заходніх губернях прывядзе да хуткага ўзмацнення польскага ўплыву. У выніку край апынецца ў тым становішчы, у якім ён быў да 1863 г., калі дваранства Мінскай і Ковенскай губерняў выказалася за далучэнне гэтых губерняў да Польшчы [3, с. 88].

У адпаведнасці з указам ад 5 кастрычніка 1906 г. (артыкул 171), пасады павятовых прадвадзіцеляў дваранства ў Ковенскай, Віленскай і Гродзенскай губернях з дазволу генерал-губернатара было прадпісана замяшчаць толькі мясцовымі дваранамі-землеўласнікамі няпольскага паходжання, а ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях — толькі з дазволу міністра ўнутраных спраў [12].

У сувязі з тым, што I і II Дзяржаўныя думы прыярытэт аддалі аграрнаму пытанню, вырашэнне праблемы аднаўлення дваранскіх выбараў у заходніх губернях адцягвалася. 21 студзеня 1910 г. падольскі губернскі прадвадзіцель дваранства І. Раковіч у дакладной запісцы на імя П. А. Сталыпіна прапанаваў правесці дваранскія выбары ў дзевяці заходніх губернях па дзвюх нацыянальных курыях — рускай і польскай. Пры гэтым руская курыя павінна была выбраць са свайго асяроддзя ўсіх прадвадзіцеляў дваранства, сакратара дваранскага дэпутацкага схода, а таксама палову дэпутатаў дваранскіх сходаў і палову засядацеляў дваранскіх апек. Польскай жа курыі выпадала выбраць толькі астатнюю палову дэпутатаў і засядацеляў [3, с. 95].

Ад пытання аб дваранскіх выбарах не застаўся ў баку і Савет аб'яднаных дваранскіх таварыстваў. У 1910 г. пры ім была створана спецыяльная Камісія па справах заходніх губерняў. Ужо 26 лістапада і 14 снежня 1910 г. яна абмеркавала пытанне аб дваранскіх выбарах у Заходнім краі. Прааналізаваўшы сітуацыю, камісія прыйшла да высновы, што ў перыяд першай рэвалюцыі польскае дваранства дзевяці заходніх губерняў імкнулася адарвацца ад Расіі. Пры гэтым антаганізм паміж польскім і рускім вышэйшымі саслоўямі яшчэ больш абвастрыўся. Таму камісія прыйшла да высновы, што хадайніцтва аб аднаўленні дваранскіх выбараў у гэтых губернях і аб прадстаўніцтве дваранства ад гэтых тэрыторый у Дзяржаўным савеце ў дадзены час не з'яўляецца своечасовым [3, с. 114].

У 1913 г. старшыня Камісіі па справах заходніх губерняў князь Н. П. Урусаў адрасаваў лісты з шасцю пытаннямі ўсім губернскім прадвадзіцелям дваранства дзевяці губерняў наконт аднаўлення выбараў. Так, віленскі губернскі прадвадзіцель дваранства Красоўскі выказаўся наступным чынам: «Дваранства заходніх губерняў толькі часткова рускае, у большасці выпадкаў, асабліва ў трох губернях былога Віленскага

генерал-губернатарства, польскае. Гэтыя часткі дваранства жывуць адасобленым жыццём і за рэдкім выключэннем маюць адзін з адным дзелавыя зносіны. Курыяльная сістэма выбараў у Дзяржаўную думу і земствы яшчэ больш адасабляюць гэтыя часткі вышэйшага саслоўя. У сувязі з гэтым у дадзены час нерэальна аднаўляць выбары, таму што ў Заходнім краі няма аднароднай дваранскай карпарацыі, а ёсць два дваранствы: рускае і польскае. Пры гэтым апошняе па сваёй згуртаванасці і інтэнсіўнасці карпаратыўнага жыцця значна пераўзыходзіць першае і таму, незалежна ад сваёй колькасці, мела б заўсёды перавагу на выбарах. Таму аднаўленне дваранскіх выбараў было б аднаўленнем іх толькі для польскага дваранства і стратай рускім дваранствам усякага прадстаўніцтва» [3, с. 155].

Падобным чынам выказаліся і іншыя губернскія прадвадзіцелі дваранства Заходняга краю: віцебскі — Рэнгартан, мінскі — Даўгова-Сабураў і магілёўскі — Бондараў.

Пытанне аб аднаўленні выбараў у дзевяці заходніх губернях падымалася ў III Дзяржаўнай думе ў сувязі з увядзеннем земстваў. Але праваакцябрысцкая большасць забалаціравала яго.

П. А. Сталыпін, прынамсі, указваў, што ў апошні час назіраецца спешная пераафарбоўка Заходняга краю ў польскую фарбу, а ўвядзенне выбарных дваранскіх пасад толькі садзейнічае гэтай пераафарбоўцы [3, с. 189].

Пытанне аб тым, чаму не былі рэалізаваны палажэнні закона ад 1 мая 1905 г., зноў было паднята ў пачатку 1914 г. у IV Дзяржаўнай думе. Яго агучыла фінансавая камісія думы пры разглядзе пытання аб павышэнні акладу засядацеля дваранскай апекі па Віленскай губерні. Тлумачэнні Міністэрства ўнутраных спраў наконт прычын неаднаўлення дваранскіх выбараў у Заходнім краі камісію не пераканалі. Але пачатак першай сусветнай вайны адклаў вырашэнне гэтага пытання на нявызначаны час.

Па разрозненых архіўных матэрыялах можна меркаваць, што пасля Лютаўскай рэвалюцыі адбыліся дваранскія выбары ў Мінскай і Магілёўскай губернях. Прызначаемыя царскім урадам прадвадзіцелі дваранства былі заменены выбарнымі. У архіве віцебскага губернскага прадвадзіцеля дваранства ёсць дакумент, на падставе якога мы можам канстатаваць, што 9 лістапада 1917 г. сакратар Віцебскага дваранскага дэпутацкага схода папрасіў сакратароў Мінскага і Магілёўскага сходаў растлумачыць, на аснове якіх законаў прызначаныя ўрадам павятовыя прадвадзіцелі дваранства былі заменены выбарнымі. Дваранскія дэпутацкія сходы дзейнічалі да 25 лістапада 1917 г.— звароту Віцебскага

губернскага распарадчага камітэта да віцебскага прадвадзіцеля дваранства накont ліквідацыі дваранскіх устаноў [13].

Такім чынам, палітыка царызму ў адносінах да дваранскага карпаратыўнага самакіравання ў краі пасля 1863 г. характарызавалася непаслядоўнасцю тактычных прыёмаў. Гэта тлумачылася як унутры-, так і знешнепалітычным становішчам, а таксама пазіцыяй тых ці іншых генерал-губернатараў. Разам з тым генеральная лінія палітыкі ўрада на працягу ўсяго разглядаемага перыяду вытрымлівалася цвёрда і ўпэўнена. Яна была накіравана на паслядоўную русіфікацыю краю, узмацненне рускага ўплыву, аслабленне сепаратызму вышэйшага саслоўя рымска-каталіцкага веравызнання.

*Літаратура і крыніцы*


1. Свод законов Российской Империи (СЗ РИ). 2-е нзд. СПб., 1876. Т. 9.
2. СЗ РИ. 3-е изд. СПб., 1899. Т. 9. Ст. 80, 91.
3. Справка по вопросу о восстановлении собраний и выборов дворянства в девяти западных губерниях (Составлена канцелярией постоянного Совета объединенных дворянских обществ). Б. м., б. г. Ч. 3.
4. РДГА ў г. Санкт-Пецярбурзе, ф. 1276, воп. 1, спр. 106.
5. Полное собрание законов Российской Империи (ПСЗ РИ). СПб., 1861. Собр. 2. Отд. 2. Т. XXXVI. № 37328.
6. НГАБ, ф. 1430, воп. 1, спр. 31058, л. 11, 17.
7. РДГА ў г. Санкт-Пецярбурзе, ф. 1283, воп. 1, спр. 41.
8. НГАБ, ф. 295, воп. 1, спр. 1828, л. 24.
9. РДГА ў г. Санкт-Пецярбурзе, ф. 1283, воп. 1, спр. 7, л. 1—2.
10. Исторический обзор деятельности Комнтета Министров. СПб., 1902. Т. 4. С. 223.
11. ПСЗ РИ. СПб., 1861. Собр. 3. Отд. 1. Т. VIII. № 5281.
12. Блосфельдт Г. Российское дворянство. Узаконения и разъяснения. 1901—1910 гг. СПб., 1910. С. 21.
13. НГАБ, ф. 2512, воп. 1, спр. 1096, л. 22, 24.


*А. И. Федкович*

## ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ПАРТНЙНО-ГОСУДАРСТВЕННЫХ ОРГАНОВ БССР ПО СОВЕРШЕНСТВОВАНИЮ ШКОЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ (1959—1972 гг.)

С середины 50-х гг. в мире развернулась научно-техническая революция, которая дала возможность комплексно автоматизировать производство, использовать ЭВМ, новые источники энергии, материалы. Это не могло не затронуть экономику СССР, а вместе с тем и БССР. Значительное развитие получили те отрасли промышленности, которые определяли технический прогресс,— приборостроение, радиотехническая, нефтехимическая, энергетика.